# Тэатралізаваная літаратурна-музычная кампазіцыя
# па творах беларускіх паэтаў
# “О, як нам вас не стае, кожны чацвёрты”,
# прысвечаная Дню Перамогі ад фашысцкіх захопнікаў

*Гучыць драматычная музыка. Гучыць Рэквіем Моцарта.*
**Дыктар:** *(за кулісай, з выкарыстаннем тэхнічнага гукавога прыёму рэвера гучыць тэкст дыктара)*

**У часе мінулай вайны загінуў**
**кожны чацвёрты беларус.**
(З дакумента)

*На сцэне пруглушана святло, амаль цёмна. Па цэнтру сцэны белы заднік. Ен падсвечваецца спецывалізаваным тэатральным ліхтаром за занавесам і размешчаны так, каб за ім можна было б ствараць дзеянне, рабіць светацені. На белым задніку з’яўляюцца светацені сілуэтаў салдатаў, якія праходзяць адзін за адным. На сцэне з’яўляюцца вядучыя, – дзяўчына і хлапец. Музыка абрываецца, гучыць гук стрэла. Сярод сілуэтаў кожны чацвёрты падае, сілуеты заміраюць на месцы ў наступным парадку: трое, чацвёртага няма. Гучыць зноў Рэквіем Моцарта, але цішэй.*

***1-шы вядучы:***
*(урывак з верша Анатоля Вярцінскага)*
*“**Рэквіем па кожным чацвёртым**”*

Вы бачылі лес,
дзе прагал скразны?
Скажыце, вы бачылі бор той,
дзе кожнай другой няма сасны
ці сама меней — чацвёртай?
Тое ж было і з народам маім.
Сякера ваеннай навалы
прайшлася бязлітасна па ім,
і — прагалы, прагалы.
Яны і сёння не зараслі,
свіцяцца прасторай мёртвай...
Вы бачылі лес,
дзе прагал скразны?
Скажыце, вы бачылі бор той?

***2-я вядучая: урывак з верша Анатоля Вярцінскага “Рэквіем па кожным чацвёртым”.***

Зямля мая бой прымала
ад стара і да мала,

ад стогадовага Талаша
да Казея — малыша.
І падаў, распасцёрты,
кожны чацвёрты.

Часта згаралі znічкі тады.
Быў небасхіл чорны.
А на зямлі стылі сляды —
кожны чацвёрты.

Мір асвятліў нас сваім святлом.
Грымелі ўрачыста акорды.
Толькі не быў за святочным сталом
кожны чацвёрты.

Доўга не трацілі ўдовы надзей,
доўга чакалі маці дзяцей.
Не верылі ўсё, што мёртвы
кожны чацвёрты.

*На экране пачынаецца рух салдат, стрэл кулі, сілуэты салдатаў знікаюць, заднік сцэны становіцца белым, тэтральныя ліхтары з абодзвух бакоў высвечваюць сілуэт маці чырвоным святлом, яна ідзе па цэнтру сцэны Маці ў чорнай сукенцы і ў чорнай хустцы. Музыка змяняецца (гучыць музыка Валерыя Іванова “Спеў дубраў”). Далей змена святла, белыае святло ліхтара высвятляе маці. Яна спыняецца пасярэдзіне сцэны, бліжэй да авансцэны. Двое вядучых робяць зварот да яе, падсвятляецца сілуэт толькі маці. Яна чытае верш Таццяны Аленінай “Матчына жалоба”.*

**Маці:**
Гора зажаўшы ў кулак,з сэрца не выпускаючы,
Маці ад болі сівая, згорбілася на век.
З вачэй ўжо слёзы не ліліся, ссохлі яны за гады,
Вочы паблёклыя ў неба ўглядаліся, - ў Бога пыталіся….
Як жа там мой, сынок?
Словы з грудзей вырываліся, голас енчыў і сіп…..
У васямнаццаць летачкаў, схавала зямелька цябе!!!!!!
Ты не кахаў дзяўчыну, не цалаваў яе,
Са школьнай лаўкі ў шынэлі, цябе на вайну павялі.
Ты не паспеў адпомнісць, і не паспеў забіць.
У першым баю загінуў, прыгожы, ласкавы хлапец.
Ляжаў раскінушы рукі, нібы лёг адпачыць.
А птушкі ў небе спяваюць, і сонейка зіхаціць.

Як жа мне жыць на свеце? Як жа мне есці і піць,
Калі мой сыночак, у гэтай магільцы спіць?
Як жа мне ўсміхацца, як на людзей глядзець?
Мне б да сынка схараніцца, у гэтай зямельцы леч.
Ды не мая ж тут воля, трэба цярпець і чакаць.
Трэба ва ўсім сусвеце, пра гэтае гора казаць.
Каб болей не лёталі кулі, каб не маглі забіваць,
Каб болей не плаклі маці, і гора ў кулак зажымаць

*Маці сыходзіць са сэны, яе так сама высвечваюць ліхтары, потым становіцца темна і праз хвіліну на задніку сцэны сілуэты шэрагі салдат , дзе на месцы кожнага чацвертага пустота.Вядучыя паварочваюцца да залу.Музыка змяняецца(гучыць Адажыо Томаса Альбіноні).*

*На экран праектуюцца слайды фотаздымкаў часоў вайны, параненых, забітых,праводзін салдат на вайну, абдымкі родных, сяброў франтавікоў. (Музыка мікшыруецца)*

**Вядучая:**

*(Генадзь Кляўко, "Лепей абдымкаў такіх не бачыць")*

Лепей ніколі, нідзе
Абдымкаў такіх не бачыць,
Калі вырываюць дзіця
З матчыных рук гарачых;
Калі адрываюць яе
Ад цела забітага мужа, –
Лепей не бачыць нідзе
Гэткіх абдымкаў дужых.
Да хрусту ў суставах рук
Абдымкі байца-героя,
Што ранены, ледзь жывы
Сціскае рукамі зброю...
Абдымкі расстанняў, стрэч
З таварышам,
Другам,
Бацькам...
Абдымкаў век не разняць
У магіле брацкай.

**Вядучая:** (*урывак з верша Анатоля Вярцінскага "Рэквіем па кожным чацвертым"*

Помнім мы болі і страты свае,
памяць шуміць, як чароты.
0, як нам вас не стае, —
кожны чацвёрты!

*У гучанні музычнай фанаграмы робіцца пауза, гучыць метраном. Пасля гучыць музыка (Адажыо Томаса Альбіноні).*

**Вядучая:**
Кожны чацвёрты быў мёртвы
Мір і спакой ім вечны!
Кожны трэці быў зморaны,
скалечаны і знявечаны.

Кожны другі на целе
меў раны, апёкі ці шрамы.
І ўсе мы, усе мы мелі
на душы сваёй раны.

*Музыка змяняецца (гучыць канцэрт рэ-мінор Баха) На экране праектуюцца сосны, дзе праз тры сасны пустэча.*

**Вядучы:** *(урывак з верша Анатоля Вярцінскага "Рэквіем па кожным чацвёртым)*

Зеўралі ямы, траншэі,
зеўралі печы ў друзе —
ранай адной страшэннай
на целе маёй Беларусі.

Лічым: чацвёрты кожны.
А можа, кожны трэці?
*На экране з'яўляюцца дзве сасны і пустэча*
Голадам падкошаныя,
паміралі дзеці.

Яшчэ мы не ўлічылі
тых, што лячылі раны,
раны не залячылі,
рана паміралі.

Колькі прапала без вестак,
без пахаванняў, памінак!
А колькі потым дзетак
узарвалася на мінах!

*Гучыць фанаграма гукаў выбухаў, гукі боя. На экране праетуецца бой, раненыя, гульня свету. Пауза, манометар. Мікшыруецца гук бамбёжак,*

*цішыня, гасне святло выходзяць яшчэ два вядучых.(гучыць музыка Д.Шастковіча да кінафільма “Гамлет” пачатак фільма).*
**Вядучы:**
*(урывак з верша Анатоля Вярцінскага “Рэквіем па кожным чацвертым”)*
Лічым: кожны чацвёрты.
А той рахунак прыблізны,
а той рахунак няцвёрды,
а ўрок яшчэ больш вялізны.
**Вядучая***: (урывак з верша Геннадзя Бураўкіна “У лясах”, цёмны экран)*
У лясах
Чужынцаў косці
Дагніваюць.
А былых салдатаў
Кулі
Даганяюць.
То інфарктам,
То сухотамі —
А толькі
Праразаюцца
Варожыя асколкі.
Хлопцы падаюць
Без крыку
І без стогну.
Раптам
Рана незагоеная
Торгне.
І аглушаць
Пульсу
Ціхія удары,
І на вочы
Наплывуць
Чужынцаў твары.
Не закрыцца
Ні акопам,
Ні бранёю,
Ні мінулай
Пераможнаю
Вайною.
Тыя кулі,
Што калісь
Заселі ў целе,
Даляцелі ўсё ж
Да сэрца,

Даляцелі.

**Эпілог**

*На сцэну з'ўляюцца дзеці з кветкамі і чытаюць па чарзе. Музыка змяняецца, гучыць музыка Валерыя Іванова "Спеў дубраў")*
**1-шы хлопец**:
(*Урывак з верша Анатоля вярцінскага "Рэквіем па кожным чацвёртым)*
Не забываецца той урок,
не зарастаюць прагалы...
«Дзеці,
вы вывучылі урок?
Дзеці,
вы праспрагалі?
**2-гая дзяўчына:**
Я іду,
ты ідзеш,
а ён не ідзе —
ён мёртвы.
Я пяю,
ты пяеш,
маўчыць кожны чацвёрты.

**3-ці хлапец:**
Мы ідзём,
ідзяце вы,
грунт пад нагамі цвёрды.
Яны не ходзяць —
не жывы
кожны чацвёрты.

*На экране праектуюцца бярозкі, якія шумяць пад ветрам.*
**4-тая дзяўчына:**
Любім мы,
любіце вы.
Колькі дзятвы,
травы,
сінявы! —
Хоць сэрца насцеж разгортвай.
***Усе разам:***
А каб яшчэ ды быў жывы
кожны чацвёрты!

*На аднік сцэны праектуецца вечны агонь, дзеці ўскладаюць кветкі перад заднікам сцэны, дзе праектуецца агонь. Гасне святло, усе сыходзяць са сцэны, на задніку сцэны гарыць агонь, занавес павольна зачыняецца.*

У сцэнарыі выкарыстоўвалася наступная літаратура:
1.Верш Анатоля Вярцінскага “Рэквіем па кожным чацвёртым” - беларуская літаратура: хрэстаматыя (складальнікі У.В.Адамчык, М.В. Адамчык – Мінск: сучасная літаратура 2004 - 100);
2.Верш Геннадзя Бураўкіна “Улясах”. Сайт беларуская ваенная паэзія. (www.sledvainy.ru – вершы пра вайну);
3.Генадзь Кляўко, "Лепей абдымкаў такіх не бачыць"
4.Верш Таццяны Аленінай “Матчына жалоба”.

Сцэнарый падрыхтавала Філіпава Таццяна Пятроўна, педагог дадатковай адукацыі дзяржаўнай установы адукацыі “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Эўрыка” г. Мінска”